# СВАБОДА

**№19(34), 7 ВЕРАСНЯ 2006 г.**


# ЗЛАЧЫНСТВА І ПАКАРАННЕ

## ПЕРШЫМІ Ў АБАРОНУ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ І МОВЫ ВЫСТУПІЛІ ШКОЛЬНІКІ

Сёлета 1 верасня кожны вучань першакласнік атрымаў падарунак — кнігу пра Беларусь. Шыкоўна выдадзеная кніга багата ілюстраваная здымкамі, на якіх можна бачыць Аляксандра Лукашэнку ў форме галоўнакамандуючага, у форме хакеіста з нумарам "1" і ў іншых абліччах і позах. Шасцігадовыя дзеткі могуць даведацца з выдання пра дасягненні Беларусі ў розных галінах пад кіраўніцтвам першага прэзідэнта – у тым ліку, у спорце і шоў-бізнесе(!). Кніга, зразумела, выдадзена па-руску.

Якім будзе лёс беларускага правапісу, змены ў які кіраўнік даручыў падрыхтаваць Міністэрству адукацыі, пакуль невядома. Вядома, аднак, што з дазволу міністэрства сёлета ў старэйшых класах можна выкладаць гісторыю Беларусі па-руску. Адпаведныя падручнікі ўжо падрыхтаваныя.

Пакуль грамадскасць млява абмяркоўвала гэтыя навеўвядзенніі, група маладых людзей 1 верасня зладзіла кампанію пратэсту на вуліцах Мінска – так званыя флэшмобы (імгненныя публічныя акцыі). Удзельнікі аднаго з іх хадзілі ў кардонных скрынях з надпісам "Беларуская мова" і збіралі подпісы ў падтрымку навучання ў школах па-беларуску. Мінакам раздавалі ўлёткі, у якіх былі такія словы: "Колькі можна моўчкі глядзець на вар'яцтва чыноўнікаў, якія проста знішчаюць нашу культуру?.. Мы звяртаемся ў гэтым годзе да Вас з заклікам прыняць удзел у інфармацыйнай кампаніі "Мы будзем навучацца па-беларуску!".

Падобныя акцыі, дарэчы, праходзілі ў той дзень таксама ў Гомелі і Навагрудку.

А на плошчы Якуба Коласа ў сталіцы ўдзельнікі флэшмоба ўсталявалі імправізаваную "шыбеніцу", на якой хлопец, апрануты катам, павесіў падручнік беларускай гісторыі для 10-га класа. Калі на плошчы з'явілася міліцыя, "экзекуцыя" ўжо скончылася.

Дарэчы, зусім нядаўна на гэтай плошчы, якая ўвесь час пільна кантралюецца міліцыяй, быў апаганены помнік




**Падручнік гісторыі на шыбеніцы.** *Удзельнік тэатралізаванай акцыі пратэсту супраць выкладання гісторыі Беларусі па-руску праводзіць "экзекуцыю" над падручнікам. Мінск, плошча Якуба Коласа, 1 верасня 2006 г.*

Якубу Коласу: на пастаменце з'явілася фашысцкая свастыка, якую доўга не змывалі.

Гэта таксама вынік той сістэмы адукацыі, якая робіць магчымым выкладаць родную гісторыю па-руску, а з гісторыяй другой сусветнай вайны знаёміць людзей з дапамогай гісторыка-культурнага комплекса ў Заслаўі пад назвай "Лінія Сталіна".


***Працяг тэмы – на стар. 2 і 4.***


## ЦІ ПАПРОСІЦЬ П.ЯКУБОВІЧ ПРАБАЧЭННЯ Ў В.ПУЦІНА


► **СТАР.5**


## ПРА ШТО «ІСКРАЦЬ» ГАЗЕТЫ

### АГЛЯД ДРУКУ


► **СТАР.6**

# НАВОШТА Ў БЕЛАРУСІ АДНОЎЛЕНА "ЛІНІЯ СТАЛІНА"?

**УЛАДЗІМІР ІСАЕНКА, ГІСТОРЫК:**

## "ТУТ ЁСЦЬ ДОЛЯ СПРАВЯДЛІВАСЦІ"

Гэта назва нямецкая, і мы калісьці ад яе адхрышчваліся. А сама лінія ўмацаванняў існавала і была вельмі развітая. У яе ўваходзілі Суражскі умацавальны раён, Полацкі, Мінскі і Мазырскі. У кожным раёне было па 400-600 бетонных умацаванняў. З іх прыкладна чвэрць былі артылерыйскія. Яны канцэнтраваліся на самых важных напрамках, каля трасаў, якія праходзілі праз лясы і балоты. Паколькі вайна была магістральнай, на гэтых шляхах ставіліся ўмацаванні. Безумоўна, напоўніцу яны выкарастаныя не былі. Бо гэтыя ўмацаванні павінны былі быць уключаны ў сістэму палявых войскаў. Але пад Мінскам так і здарылася. Абарона цягнулася тры дні. Былі зацятыя баі ў Заслаўі. 44-ты корпус змагаўся, калі Мінск ужо быў заняты немцамі, некалькі дзён трымаўся ў дотах. Камандванне баялася паведаміць, што Мінск пакінуты.

**ІГАР КУЗЬНЯЦОЎ, ГІСТОРЫК:**

## "РЭАНІМАВАЛІ ТЭРМІНАЛОГІЮ ГЕБЕЛЬСА"

Тэрмін "Лінія Сталіна" быў уведзены ў "навуковы зварот" Гебельсам. Ад 1945 году да распаду СССР тэрмін "Лінія Сталіна" ні ў воднай кнізе не выкарыстоўваўся. Замест гэтага быў тэрмін "Лінія ўмацаваных раёнаў на старой мяжы СССР". У верасні 1939 году, калі часці Чырвонай арміі пачалі так званы вызваленчы паход, і фашысцкая Германія стала саюзніцай СССР, яна звярнулася з патрабаваннем да Савецкага Саюзу дэмантаваць лінію ўмацаваных раёнаў на старой мяжы. У выніку 22 чэрвеня 1941 году нямецка-фашысцкія войскі не сустрэлі арганізаванага супраціву. Таму што гэтая лінія была фактчына дэмантаваная і пакінутая войскамі. А сёння рэанімавалі тэрміналогію Гебельса. Той фрагмент умацаванага раёна, які зараз адноўлены, гэта тое, што было ўвосені 1939 году. Калі ўявіць гэты ж умацаваны раён на стан 22 чэрвеня 1941 году, тады трэба прыбраць адсюль усе гарматы, кулямёты, запасы ўзбраенняў, харч, траншэі і ўсё астатняе. Гэты ўчастак нямецкія войскі прайшлі без усялякага супраціву. Калі б там сапраўды тры дні ўтрымлівалі праціўніка, тады б немцаў не было ў Мінску 26 чэрвеня. Нідзе ў савецкай гісторыі не зафіксаваны гераізм савецкіх войскаў у гэтым раёне. Калі б яны абараняліся тры дні, пра гэта было б напісана ва ўсіх падручніках. Сёння гэта тэатралізаванае прадстаўленне, якое 1941 год ніяк не нагадвае.

**МІКАЛАЙ, СУПРАЦОЎНІК МУЗЕЯ:**

## "СТАЛІН І ГІТЛЕР – ДВА ЎРОДЫ"

Я ведаю, што без гэтай лініі немцы ў Мінску былі б на чатыры дні раней. А як я стаўлюся да Сталіна? Таксама, як і да Гітлера. Два ўроды. Адзін аднаго вартыя. Калі вайскоўцы-прапаршчыкі ўсталёўвалі гэты бюст, дык тросамі абламалі Сталіну вушы. Я ім кажу – ды за такую работу ў тыя часы вам 25 гадоў далі б ці на месцы б расстралялі. Смяюцца. Ён ужо не страшны. А тады, у 1945-м, я чытаў, мы маглі перамагчы Амерыку з Брытаніяй. Зараз Іспанія гаварыла б па-руску.

**ВАЛЯНЦІНА, НАВЕДНІЦА МУЗЕЯ:**

## "ЗАБАЎНЫ АТРАКЦЫЁН"

Забаўны атракцыён. Адзін раз наведаць можна. А наконт бюста Сталіна? Дзякуй Богу, што хоць помнік не паставілі. Ад нашых уладаў можна чаго заўгодна чакаць.

**МІХАІЛ, НАВЕДНІК МУЗЭЯ:**

## "ДЗЕЦІ Ў ЗАХАПЛЕННІ"

Клас! Дзеці ў захапленні. Прыедзем абавязкова яшчэ раз. Сталін? Ды хай стаіць. Каму ён перашкаджае? Гэта ж наша гісторыя. Яе не перапішаш.

**МІКАЛАЙ, ВЕТЭРАН ВАЙНЫ, УДЗЕЛЬНІК БЕРЛІНСКАЙ АПЕРАЦЫІ:**

## "НЕ СТАЛІН ВЫЙГРАЎ ВАЙНУ"

Вядома, што не ведалі мы ніякай лініі Сталіна. І не маглі ведаць. Бо ўсё, што тычылася абароны, тым больш на мяжы, было пад вялікім сакрэтам. А тое, што зараз яго імя вяртаюць... Я гэта не падтрымліваю. Хоць многія мае аднагодкі за яго гарой стаяць. У сённяшнім дні яму рабіць няма чаго. Не ён выйграў вайну. А ўжо ўсхваляць яго за першыя дні вайны...

**КАНСТАНЦІН, БІЗНЕСМЕН:**

## "РОБІЦЦА ЯСНЕЙ, ХТО НАМІ КІРУЕ"

"Лінія Сталіна" ідэальна ўпісваецца ў наш сённяшні палітычны ландшафт. Як ім толькі прыйшла ў галаву такая геніяльная ідэя? Гэта для іх вельмі арганічна, натуральна і надзвычай удала. Вось калі б яны зрабілі сваім сімвалам Мірскі замак – гэта было б абразліва. Як для іх, так і для Мірскага замка. А Сталін – гэта тое, што ім трэба. І ні ў якім разе не варта ім замінаць у іхніх пачынаннях. Хай ставяць яму помнікі. Было б добра, каб яны вярнулі старую назву галоўнаму мінскаму праспэкту. Хай давядуць сваю дурасць да поўнага абсурду. Ад гэтага ўсім карысць. Яны "палучают ісціцічэскае удавольствіе". А нам робіцца ясней, хто намі кіруе.

**ЮРАСЬ, НАСТАЎНІК ГІСТОРЫІ:**

## "МАРАЛЬНАЕ ВЫХАВАННЕ Ў ПОЎНЫМ АБ'ЁМЕ"

Летась з Міністэрства адукацыі мы атрымалі інструктыўна-метадычнае пісьмо па ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце, дзе ў рамках "идейно-нравственного воспитания» было рэкамендавана наведанне святых для кожнага беларуса месцаў. І першай у спісе гэтых месцаў стаяла не Хатынь, не Мірскі замак, не Навагрудак, а менавіта "Лінія Сталіна". Мы з дзецьмі з'ездзілі. Многім спадабалася. Гэткі вайсковы "дыснейлэнд", дзе можна палазіць па акопах. Нейкая вайсковая часць там прымала прысягу. Настрой у маладых салдат быў прыўзняты. Іхнія мацюкі было чуваць далёка. Адным словам, "маральнае" выхаванне мы атрымалі ў поўным аб'ёме.

# МІЛІНКЕВІЧ ПЕРАСЦЕРАГАЕ АД ЛІКВІДАЦЫІ ДЗЯРЖАВЫ

## БЕЛАРУСЬ МОЖА СТРАЦІЦЬ СУВЕРЭНІТЭТ ПРАЗ ЧАРГОВЫ РЭФЕРЭНДУМ



У мінулы панядзелак лідэр беларускай апазіцыі Аляксандр Мілінкевіч вярнуўся з Францыі, дзе сустракаўся з міністрам унутраных спраў гэтай краіны Нікаля Сарказі, міністрам замежных спраў Філіпам Дуст-Блезі, старшынём Парламенцкай асамблеі НАТО П’ерам Лялюшам. У той жа дзень Мілінкевіч выступіў са Зваротам да беларускага народу.

І паездка ў Францыю і Зварот тычацца адной тэмы…

У сваім Звароце А.Мілінкевіч выказвае думку, што рэферэндум пра ўваходжанне Беларусі ў склад Расіі Лукашэнка прызначыць у бліжэйшыя месяцы.

“Цяперашні кіраўнік Беларусі доўга гуляў у інтэграцыю, бо надзвычай хацеў стаць самадзержцам «усяе Русі». І дагуляўся. Плануецца рэферэндум па стварэнні так званай Саюзнай дзяржавы. Гэта не будзе аб’яднанне роўных. Наш лёс стане вырашаць «саюзнае» кіраўніцтва, дзе ў нас будзе нашмат менш галасоў, чым у суседзяў. Зноў па дазвол на ўсё будзем ехаць на паклон у сталіцу Расіі”.

Пералічыўшы негатыўныя наступствы такога аб’яднання, А.Мілінкевіч заклікаў беларусаў не паддавацца на правакацыі ўладаў:

“Мы павінны захаваць нашу Беларусь незалежнай. Святым не гандлююць. Бацькаўшчына дасталася нам ад продкаў, і мы мусім захаваць яе для нашых нашчадкаў. Толькі незалежная Беларусь можа забяспечыць сваім грамадзянам дабрабыт і спакой”, — заявіў Мілінкевіч..

**Паводле СМІ**

## СТАТКЕВІЧА ПЕРАВОДЗЯЦЬ У ПУХАВІЦКІ РАЁН

*Адміністрацыя баранавіцкай спецкамендатуры паведаміла Міколу Статкевічу, што яго пад аховай павязуць адбываць пакаранне ў іншае месца.* Пры гэтым быў названы Пухавіцкі раён. Кіраўнік спецкамендатуры паведаміў Статкевічу, што перавод робіцца згодна з распараджэннем мясцовага пракурора.

Пракурор спаслаўся на тое, што Мікола Статкевіч адбывае пакаранне ў парушэнне заканадаўчых нормаў: паколькі палітык прапісаны ў Мінску, ён павінен адбываць пакаранне ў Мінскай вобласці.

Былы кіраўнік Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі “Народная Грамада” Мікола Статкевіч больш за год правёў на “хіміі” ў Баранавічах за арганізацыю вулічных дэманстрацый пратэсту супраць фальсіфікацыі вынікаў выбараў і рэферэндума 2004 году.

Мікола Статкевіч лічыць, што перавод можа адкласці на далёкую перспектыву яго ўмоўна-датэрміновае вызваленне. Палітык непакоіцца, што супраць яго могуць быць ужытыя правакацыі, каб яго рэальна пазбавіць волі.

**Радыё Свабода**

## ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ “ВКЛ” АКАЗАЛАСЯ БЯСПЛАТНАЙ

Лепшым выданнем мінулага году прызнаны першы том энцыклапедыі “Вялікае княства Літоўскае”.

Нядаўна ў Паставах, падчас святкавання Дня беларускага пісьменства, адбылася ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання. Разам з энцыклапедыяй “ВКЛ” першую прэмію атрымалі кніга Віктара Альшэўскага “Уражанне раўнавагі, або Лесвіца ўверх”, а таксама фотаальбом “АЛМАЗ в действии”. (Альбом прысвечаны спецпадраздзяленню міліцыі).

Суседства гэтых трох кніг падаецца даволі дзіўным, хоць і ў пэўнай ступені паказальным. Прычым найбольш нечаканым у гэтым спісе выглядае якраз “ВКЛ”. Хадзілі чуткі, быццам бы праца над другім томам кнігі прыпынена, паколькі нехта “зверху” палічыў, што яна не адпавядае сучасным ідэалагічным устаноўкам.

І вось на днях стала вядома, што другі том энцыклапедыі нарэшце падпісаны ў друк.

Тым не менш, другі том выйдзе са значнымі купюрамі. Калі ў першым томе змяшчаюцца слоўнікавыя артыкулы на 11 літар (ад А да К), то ў другім у адну кнігу ўдалося загнаць астатнія 21.

Між тым, шмат каму з аўтараў дзяржаўнае выдавецтва дагэтуль не выплаціла ганарары за першы том.

**Паводле www.gazetaby.com**

## БЕЛАРУСЬ І СУСЕДЗІ

### Украінцы сталі жыць лепей

На працягу апошняга году Беларускае тэлебачанне амаль штодня расказвала гледачам пра крызіс улады, які, нібыта, ахапіў Украіну пасля “аранжавай рэвалюцыі”. Паводле БТ, крызіс дасягнуў такой мяжы, што звычайнаму ўкраінцу хоць кладзіся ды памірай. Але на справе ўсё не так кепска.

У краіне танныя крэдыты. Напрыклад, працэнтная стаўка крэдыту на пакупку новага аўтамабіля ў параўнанні з беларускай меней амаль у пяць разоў. Аднаразовая выплата на нараджэнне дзіцяці складае тут 1500 даляраў. У Беларусі маладыя бацькі пра такое і не мараць!

Цэны на прадукты харчавання ў Кіеве, плата за праезд у сярэднім утрая ніжэй, чым у Мінску. Ніжэй тут і камунальныя плацяжы, хоць Украіна плаціць Расіі значна болей за газ.

Сярэдняя зарплата ў чэрвені 2006 году наблізілася да 1000 грыўнаў. (Пры курсе даляра 5,05 грыўны).

Даследаванне Дзяржкамстата Украіны, якое ахоплівала 9 тысяч украінскіх сем’яў, паказала, што іх сярэднія даходы за месяц у 2005 годзе перавысілі гэты паказчык 2000 году больш як у тры разы, дасягнуўшы 1300 грыўнаў. Пры гэтым доля зарплат і пенсій у рэсурсах хатніх гаспадарак вырасла з 53% да 70%. Доля выдаткаў на харчаванне скарацілася з 68% да 61%, але пры гэтым спажыванне мяса і малака на душу насельніцтва вырасла на траціну.

Найбольш масавай — 40% гарадскога насельніцтва — стала група, якой хапае грошай на харчаванне, адзенне і абутак.

Украінцы актыўна будуюць жыллё і купляюць у крэдыт аўтамабілі і бытавую тэхніку. Людзям стае на жыццё. І ў гэтым, зразумела, ёсць заслуга ўкраінскай улады. За што, напэўна, яе зацята крытыкуюць як расійскія тэлеканалы, гэтак і БТ.

**Алег Ман**

# ЗЛАЧЫНСТВА І ПАКАРАННЕ

## ПЕРШЫМІ Ў АБАРОНУ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ І МОВЫ ВЫСТУПІЛІ ШКОЛЬНІКІ

Тое, што гісторыка-культурны комплекс "Лінія Сталіна" пад Заслаўем штодня наведваюць сотні турыстаў, насамрэч, няблага. Значыць, людзі цікавяцца не толькі днём сённяшнім. Іншая рэч, ці гатовыя яны прыняць дэкарацыі "Лініі Сталіна" за сапраўдную карціну мінулае вайны?

Супрацоўнік музея лічыць, што гэтая лінія абароны затрымала прыход немцаў у Мінск на чатыры дні. Мінск быў заняты гітлераўцамі 26 чэрвеня. Атрымліваецца, што калі б не "Лінія Сталіна", яны ўзялі б сталіцу Беларусі 22 чэрвеня, ў першы дзень нападу Германіі на СССР. Але калі ў чалавека не хапае адукацыі, каб палічыць да трох, гэта не так страшна.

Горш для шырокай публікі, калі адукаваныя гісторыкі не толькі даюць процілеглыя ацэнкі падзеям мінулага, але разыходзяцца ў фактах. Адзін сцвярджае – абараняліся тры дні, другі кажа, што гэтага не магло быць. Добра, хоць сышліся на адным: назва "Лінія Сталіна" – нямецкая.

Дазволю сабе спаслацца на меркаванне яшчэ аднаго чалавека, не гісторыка. Маю на ўвазе Віктара Суворава (Разуна) – былога агента савецкай разведкі, які ў 1978 годзе збег на Захад і быў завочна асуджаны да расстрэлу. Аднак, яго трылогія "Цень Перамогі" (асабліва першая кніга – "Ледакол") заваявала шырокае прызнанне чытачоў. Цікава, што пісьменнік карыстаецца пры напісанні сваіх кніг толькі тымі дакументамі і іншымі крыніцамі, якія апублікаваныя ў адкрытым друку.

Вось што піша пра "Лінію Сталіна" Віктар Сувораў у сваёй кнізе "Ледакол" : "Увосені 1939 году, у момант пачатку другой сусветнай вайны, у момант усталявання



**Вушы адарвала тросам**... *Бюст Сталіна ў вёсцы Арэхаўка, Мінскі раён, жнівень 2006 году.*

агульных межаў з Германіяй (паводле Пакта Молатава Рыбентропа. – заўвага рэд.) усе будаўнічыя работы на «Лініі Сталіна" былі спыненыя (В.А. Анфилов. Бессмертный подвиг. С. 35 ). Гарнізоны ўмацаваных раёнаў на «Лініі Сталіна» былі спачатку скарочаныя, а затым цалкам расфармаваныя. Савецкія заводы спынілі выпуск узбраення і спецыяльнага абсталявання для фартыфікацыйных пабудоваў. Існуючыя УРы былі раззброены, узбраенне, боепрыпасы, прыборы назірання, сувязі і кіравання агнём былі здадзеныя на склад (Военно-исторический журнал, 1961. №9. С.120). Працэс знішчэння "Лініі Сталіна» набірае хуткасць. Некаторыя баявыя збудаванні былі перададзеныя калгасам у якасці сховішчаў для гароднiны. Большасць баявых збудаванняў была засыпана зямлёй…

Увесну 1941 году трагедыя "Лініі Сталіна" дасягнула апафеозу. "Я не ведаю, як будучыя гісторыкі патлумачаць гэтае злачынства супраць нашага народу. Цяперашнія абыходзяць гэтую падзею поўным маўчаннем, а я не ведаю, як патлумачыць. Многія мільярды рублёў (паводле маіх падлікаў, не менш за 120) злупіў савецкі ўрад з народу, каб пабудаваць уздоўж усяе заходняе мяжы непрыступныя для ворага ўмацаванні… І напярэдадні самой вайны – увесну 1941 году – загрымелі магутныя выбухі па ўсёй 1200-кіламетровае лініі ўмацаванняў… дзясяткі тысяч даўгатэрміновых абарончых збудаванняў былі ўзнятыя ў паветра па асабістым загадзе Сталіна". (Генерал-майор П.Г. Григоренко. В подполье можно встретить только крыс. С. 141).

Віктар Сувораў ідзе далей за генерала Пятра Грыгарэнку. Ён тлумачыць разбурэнне "Лініі Сталіна" намерам "бацькі народаў" апярэдзіць Гітлера і першым нанесці ўдар па Германіі, каб потым захапіць усю Еўропу. У такім выпадку моцныя абарончыя збудаванні ў тыле былі б непатрэбныя, яны толькі замінялі б наступальнай аперацыі.

Нават калі Сувораў памыляецца адносна намераў савецкага правадыра, гістарычны факт застаецца фактам – "Лінія Сталіна" была знішчана перад самым нападам Германіі на СССР. І гаварыць аб яе ролі ў абароне Беларусі, а тым больш, рабіць з яе мемарыял, культавае месца, недарэчна. Сталін быў прыцягнуты сюды беларускімі ўладамі за тыя самыя вушы, што былі адарваныя тросамі пры мантажы помніка тырану.

І на гэтай лухце, на помніках крываваму правадыру афіцыйная прапаганда хоча выхоўваць новае пакаленне беларусаў. А што тут здзіўляцца?

Праз шэсцьдзесят адзін год пасля канчыны фюрэра ў сваім бункеры, у Беларусі выходзіць часопіс "Спецназ" (№4 за 2006 год), які распаўсюджваецца ва ўстановах падрыхтоўкі ўнутраных войскаў МУС. У часопісе, у матэрыяле пад назвай "Гонар маем!" надрукаваныя такія радкі: «Не безынтересным, я думаю, для многих будет кодекс чести офицера, написанный Адольфом Гитлером. При всей одиозности этой личности, над многими постулатами, им декларируемыми, есть смысл задуматься... Любовь к фюреру, народу и отечеству превыше всего. Поэтому офицер обязан четко отделить себя от тех, кто стоит в стороне от германского пути и борьбы».

Мабыць, палажэннямі гэтага кодэксу негалосна кіраваліся спецназаўцы, якія ліквідавалі палатачны гарадок на Кастрычніцкай плошчы сёлета ў сакавіку, збівалі мірных дэманстрантаў на Дзень волі, кідалі за краты і збівалі маладых і старых людзей, у тым ліку ветэранаў мінулай вайны?

Рана ці позна гэтым дзеянням, як і дзеянням навяўленага фюрэра будзе дадзеная справядлівая ацэнка ў падручніках гісторыі Беларусі. Напісаныя яны будуць па-беларуску. У гэтым сёння не сумняваюцца нават школьнікі.

**А. Уласаў**

# ПУГА ДЛЯ ЛУКАШЭНКІ

## РАСІЯ ПАГРАЖАЕ ВЫЙСЦІ З ПАГАДНЕННЯ АБ РОЎНЫХ УМОВАХ ЦЭНАЎТВАРЭННЯ

Прыканцы лета ўзніклі новыя складанасці паміж уладамі Беларусі і Расійскай Федэрацыі. Па-ранейшаму застаецца нявырашаным пытанне пра цэны на газ для Беларусі на 2007 г., а расійскае кіраўніцтва паднесла афіцыйнаму Мінску новую неспадзянку. Расія заявіла пра магчымасць выхаду ў студзені наступнага году з пагаднення з Беларуссю аб роўных умовах у галіне цэнавай палітыкі.

Выхад Расіі з узгаданага пагаднення будзе новым сур’ёзным ударам па эканоміцы Беларусі. Бо менавіта ў адпаведнасці з гэтым пагадненнем Беларусь атрымлівае танныя расійскія энерганосьбіты. Відаць, урад РБ ужо сам не верыць у тое, што з расійскім бокам гэтым разам удасца дамовіцца. Пра гэта сведчаць спробы ўраду хоць неяк знізіць страты ад магчымага энергетычнага крызісу.

Нядаўна было прынятае рашэнне пра энергетычны маніторынг (агляд) усіх беларускіх прадпрыемстваў. Крыху пазней – рашэнне стварыць пры старшыні ўраду аператыўную групу для “энергазабеспячэння прадпрыемстваў жыллёва-камунальнага сектару”. Наколькі гэта дапаможа – пытанне спрэчнае.

Відавочна, што выцягнуць усе прадпрыемствы не ў стане ніякі ўрад. Так што калі Расія сапраўды давядзе пачатае да завяршэння і ўзніме цэны на газ да еўрапейскага ўзроўню, дык беларускай “стабільнасці” ўжо гэтай зімой прыйдзе канец. Бо ўся гэтая стабільнасць будуецца на танных энерганосьбітах. Чаму?

Вось як адказвае на гэтае пытанне беларускі палітолаг Уладзімір Роўда: “Пуцін прапусціў Лукашэнку на трэці тэрмін, але на пэўных умовах. Зараз ад беларускага кіраўніка патрабуюць, каб ён пайшоў на расійскую мадэль інтэграцыі. Безумоўна, Лукашэнка не хацеў бы гэтага рабіць, бо тая мадэль адчыняе прастору ў першую чаргу для расійскага бізнесу і вядзе да страты Лукашэнкам значных уладных паўнамоцтваў. Але ёсць пуга, якой зараз актыўна карыстаецца Расія – гэта цэны на газ, нявырашанае пытанне з “Белтрансгазам” і пагроза Расіі зусім скасаваць пагадненне аб ільготных цэнах на газ. Я лічу, што зараз Лукашэнка будзе імкнуцца прытармазіць гэты працэс. Але ягоныя магчымасці вельмі абмежаваныя”.

І Расія, дадамо, гатовая зрабіць усё, каб кіраўнік беларускай дзяржавы нарэшце заплаціў па сваіх рахунках. Хоць беларусам, зразумела, радавацца такому павароту падзей не давядзецца.

**Алег Ман**

**Ад рэдакцыі:** *На пачатку верасня, выступаючы ў Пінску, А.Лукашэнка заявіў, што Беларусь ніколі не будзе купляць у Расіі газ за большыя кошты, чым Германія. Як водзіцца, кіраўнік дзяржавы крыху перабраў – Германія, як і большасць іншых краінаў Еўропы, купляе газ па 250 даляраў за тысячу кубаметраў. Максімальная цана для Беларусі (калі спраўдзяцца самыя змрочныя пагрозы “Газпрома”) складзе 200 даляраў. Але справа, зразумела, не ў лічбах. Лукашэнка згадаў Германію ў сваёй заяве толькі для таго, каб сказаць, што ў Беларусі яшчэ жывыя тыя людзі, якія “ваявалі разам з расіянамі ў адных акопах”. (Трэба разумець – у вайне з Германіяй). Падобныя словы ад кіраўніка дзяржавы мы ўжо чулі падчас мінулага крызісу ў адносінах з Масквой, калі расійскі газ быў на некаторы час адлучаны за няўплату. Няўжо сапраўды пагроза энергетычнага крызісу для Беларусі настолькі ўзрасла, што ў Лукашэнкі зноў здаюць нервы і ён звяртаецца да савецка-патрыятычнай рыторыкі як да апошняга аргументу?*

# “ПРАСТЫТУТКА” І “ГАСТАРБАЙТЭРЫ”

## ЦІ ПАПРОСІЦЬ “СОВЕТСКАЯ БЕЛОРУССИЯ” ПРАБАЧЭННЯ Ў ПУЦІНА?

Пра тое, што кошты на газ будуць уздымацца, было вядома ўжо некалькі месяцаў. Натуральна, што пра гэта пісалі незалежныя газеты, у тым ліку і расійскія. Адзін з артыкулаў выклікаў асабліва вострую рэакцыю ў “Советской Белоруссии”. Галоўны рэдактар Павел Якубовіч вырашыў тады асабіста “дать отпор” паклёпнікам.

Гаворка ідзе пра публікацыі ў маскоўскай газеце “КоммерсантЪ” карэспандэнткі Наталлі Грыб, якая, між іншым, паходзіць з Беларусі. (Былы старшыня Вярхоўнага Савету Беларусі Мечыслаў Грыб даводзіцца ёй сваяком.) Журналістка адсочвае тэму газавых дачыненняў паміж Расіяй ды Беларуссю і час ад часу пра гэта піша. Зразумела, што яна не абышла ўвагай і намер “Газпрому” падвысіць цану газа для Беларусі.

Што тут пачалося! Па-першае, ад Якубовіча дасталося самому “Коммерсанту”, інфармацыя якога была названая “грубой стряпнёй”. Рэдактар “СБ” прыгадаў, як нейкі ананімны маскоўскі госць пад час нейкага семінару (гэта такі сучасны аналаг “адна баба казала”) прапанаваў лічыць мерай прадажнасці слова “коммерсант”. Нібыта менавіта гэтае выданне вызначаецца асабліва “распуснымі” паводзінамі на рынку прэсы.

Дайшла ў той публікацыі чарга і да “недавней минчанки, девушки с очень своеобразной репутацией, Натальи Гриб, в недавнем прошлом — минской журналистки, а ныне — гастарбайтерши в «Коммерсанте»”. Ужо гэтыя выказванні — абразлівыя, але “СБ” не супынілася. Сваю суайчынніцу газета назвала “обычной специалисткой по высасыванию, которая сейчас, понятное дело, нуждается, озабочена и потому берется за самую грязную работу”. У дадатак да ўсяго газета паведамляла, што “сочинение девицы Гриб, заказанное и оплаченное по тарифам обочины славной улицы Тверской”.

На Цвярской у Маскве гадоў дзесяць таму стаялі прастытуткі. Пасля іх адтуль сагналі, аднак слава за вуліцай засталася. Гэтаксама і “СБ” будзе цяжка пазбавіцца сваёй рэпутацыі, нават калі зменяцца яе цяперашнія гаспадары. Бо такія артыкулы — па-за межамі прыстойнасці. Нават калі б інфармацыя Наталлі Грыб не адпавядала рэчаіснасці.

Аднак мінула зусім няшмат часу і высветлілася, што журналістка мела рацыю. Сапраўды, як яна і пісала, Расія не збіраецца болей датаваць рэжым Лукашэнкі. Кошты на энерганосьбіты будуць істотна ўзнятыя, прычым ад гэтага не выратуе нават імаверны продаж “Белтрансгазу”.

Цікава, што цяпер напіша прэзідэнцкі орган? Можа, хопіць смеласці ў гэткіх жа выразах выказацца пра Пуціна? Дарэчы, калі газета назвала журналістку “Камерсанта” “гастарбайтэршай”, то кім лічаць сябе самі супрацоўнікі “СБ”? І па якіх тарыфах аплочваюцца іх паслугі?

**Васіль Філін**

# "БЫЦЦАМ БЫ ЎЛАДА ГУБІЦЬ МОВУ..."

## ПРА "САКАВІЦКІХ КАТОЎ", РУСАФІЛАЎ І СВЕЧКІ

«Народная газета» прыцягнула ўвагу праблемным матэрыялам. Тэма – вандалізм некаторых беларускіх грамадзян. Аказваецца, далёка не ўсе грамадзяне маральна гатовыя жыць у цывілізацыі. Дзяржава церпіць ад іхнай несупыннай дзейнасці мільённыя страты. Але з вандалізмам можна змагацца. Рэцэпты прыводжу ніжэй:

*"Исходя из принципа наименьшего сопротивления, в белорусских городах решили искоренить хулиганов научным методом: например, в столице к началу сентября должны быть приведены в порядок все остановочные пункты. Для борьбы с уличными хулиганами рассматривается вариант использования на остановочных навесах вместо стекла более прочных материалов. Кстати, идея о создании антивандального оборудования посетила уже едва не все сферы: в Могилеве пробуют сделать антивандальные лифты, повсеместно в продаже появляются почтовые ящики, которые нельзя поджечь".*

Во куды сягнула айчынная навука! Засталося толькі вынайсці ўслончык, на якім немагчыма накрэмзаць тры літары, тэлефон з неадрывальнай слухаўкай ды ліхтар з неразбівальнай лямпачкай. Прынамсі, гэта выглядае меншай фантастыкай, чым выхаванне культурнага грамадзяніна сённяшняй дзяржавай. Якая сама руйнуе ўсё, што трэба берагчы. А ўсё ж цікава, як выглядае антывандальны ліфт? Ён што, токам пачынае біцца?..

А Яўген Росцікаў у газеце "Рэспубліка", разважаючы пра мараль грамадства і шанцы апазіцыйных кандыдатаў на будучых выбарах у мясцовыя саветы, піша:

*"Действительно, если даже мимо какого-нибудь сельского или поселкового Совета тот же Лебедько или Милинкевич «пролетит», то на что более могут рассчитывать эти господа. Даже их хваленые эксперты уже понимают, что время этих «лидеров» давно уже кончилось. А так по-прежнему можно будет надувать щеки, и убеждать западных покровителей, что мы не участвуем в качестве кандидатов в этих выборах, потому что не хотим закрывать дорогу молодым, хотя бы тем, что, как коты, в палатках на столичной площади в марте тешились".*

Сапраўды, якія могуць быць шанцы ў апазіцыянераў, калі ў дзяржаўнай прэсе ёсць такія хлёсткія пёры. Прачытаеш — і быццам нагою ў дзярмо ступіў. Бо, як вядома і таварышчу Росцікаву, "мартаўскія каты" працягвалі "цешыцца" ў турмах на Акрэсціна і ў Жодзіне. А колькі "катоў" яшчэ не збіраецца чакаць чарговага сакавіка! Цікава, для каго піша той Росцікаў? І як уяўляе "Рэспубліка" свайго чытача? Здаецца, такіх не існуе ў прыродзе. Прынамсі, сярод тых, хто ўвогуле чытае газеты.

"Советская Белоруссия" ізноў не шкадуе сваёй газетнай плошчы для барацьбы з нацыянальнай гісторыяй. На гэты раз прафесар Пётр Петрыкаў, так бы мовіць, палемізуе з калегамі ў пытанні нацыянальных інтарэсаў беларускага народа.

*"Некоторым белорусским историкам стала костью в горле историческая борьба белорусского народа за воссоединение с братским русским народом. Поэтому народно–освободительную войну украинского и белорусского народов под руководством Богдана Хмельницкого они, ничтоже сумняшеся, заменили без всяких доказательств на антифеодальную или казацко–крестьянскую войну. Замалчивая при этом, что Левобережная Украина по решению Переяславской Рады 1654 года воссоединилась с Россией, а Беларусь не смогла добиться этого.*

*Такую же неприязнь к России заняли они после воссоединения белорусского народа с русским народом в едином Российском государстве в конце XVIII в. в ходе трех разделов Речи Посполитой в 1772, 1793 и 1795 годах. Чего тут не наговорено об «азиатской» России! Она–де душила Беларусь по всем направлениям: и шляхетские вольности упразднила путем «разбора шляхты», и рекрутчину ввела, и запретила употребление белорусского языка в школах, и даже употребление слова «Белоруссия», и насаждала у нас русских помещиков, и присылала русских учителей, и т.п.*

Што ні кажыце, а працаздольнасць прыхільнікаў Мураўёва-вешальніка і "Мікалая Палкіна" ўражвае. Ужо трэцяе стагоддзе пайшло, а ў іх імпэт не сканчаецца даказваць "вверенному населению", хто яму сябра, а хто вораг. Прычым, не ў падпольных брашурах, а ў цэнтральных губернскіх газетах. А жаданага выніку ўсё няма. Штосьці ім заўсёды замінае. І будзе замінаць. Бо гэтае "штосьці" мацней за ўсе дзяржаўныя наклады і датацыі. Гэта жаданне беларусаў заставацца самімі сабой.

А вось кіраўнік наваствораната лукашэнкаўскага Саюзу пісьменнікаў (не блытаць з Саюзам беларускіх пісьменнікаў) "сенатар" Мікалай Чаргінец дае інтэрв'ю "ЛІМ"у з нагоды Дня беларускага пісьменства.

*"(ЛІМ: ) Многія пісьменнікі кажуць, што беларуская мова ў заняпадзе...*

*(Чаргінец: ) Так крычаць толькі некаторыя асобы і хочуць даказаць, што быццам бы ўлада губіць мову. На мой погляд, ніхто не зрабіў для папулярызацыі беларускай мовы больш за Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнку. Менавіта па яго ініцыятыве калісьці ўсе шыльды з назвамі вуліц сталі беларускамоўнымі..."*

Наконт шыльдаў сказана моцна. Ход канём. Ну, не пра закрытыя ж беларускія школы і газеты гаварыць у такі святочны дзень. Што праўда, мінскія шыльды былі беларускамоўнымі і ў тыя часы, калі Лукашэнка яшчэ кіраваў сваім саўгасам. Аднак, доля праўды ў словах Чаргінца ёсць. Мова, якая выжыве пад такою дзяржаўнаю "апекай", як сёння, ужо дакладна не загіне.

А на заканчэнне прывяду цытату з "Белорусской военной газеты». Цытата яскрава дэманструе агульны ўзровень афіцыйнай журналістыкі – заўважце, рускамоўнай. Пішучы пра аўтамабільныя праблемы, журналіст Уладзімір Корань пачынае свой артыкул так:

*"Помните слова из песни: «Свеча горела на столе?» Автомобильная свеча не должна гореть. Ее функция – искрить».*

Не ведаю, як свечка, а "БВГ" іскрыць спраўна. Шкада, што Барыс Пастэрнак не пакінуў нам песні пра карбюратар і шаравую апору.

**Алесь Канючыц**

СТРЭМКІ

# ПАНК, УНУК ПАНКА

Учора бачыў панка. Дакладней – панчаня, гадоў 16. А так – усё на месцы: аранжавы грэбень тырчком пасярод галавы; чорная куртка, ланцугі, у носе, губе, вушах – жалеза; хадакі на тоўстай падэшве. Прывітанне з канца XX стагоддзя? Ды яно, здаецца, і не скончылася. Мабільнікі з’явіліся, а СССР знік – у XX-м. Неяк не відаць нічога, што было б выключна праяваю XXI ст.



Тэарэтычна я павінен бы расчуліцца ад таго, што бачу на вуліцах людзей, апранутых так, як я сам трыццаць гадоў таму. А мне – нудна. Бо нецікава. Пераменаў хачу! А іх – няма.

Вось у Вільню прыязджаў сам сэр Элтан Джон. Па беларускіх «галасах» сказалі з зайздрасцю – гэта вам не Ала Пугачова. А я не бачу вялікай розніцы паміж гэтымі двума экспанатамі. Проста адзін больш раздзьмуты рэкламай. Да таго ж сэр Джон любіць строіцца ў жаночыя сукні, а Ала Барысаўна – «сама лошадь, сама бык, сама баба и мужик».

Час зрабіўся вязкім, бы смала. Усё яшчэ канцэртуюць гурты, славутыя гадоў сорак назад. Аддаеш ім належнае за даўгалецце, але міжволі шукаеш у складзе ўдарніка Паркінсона ды вакаліста Альцгеймера.

Беларусь увогуле застыла ў часе, бы муха ў бурштыне. (О, каб гэта быў бурштын...) Ідзеш вуліцай Чапаева да праспекта Фрунзе і выходзіш на плошчу Леніна. А ў вёсцы – не сяляне, а “калхозьнікі”. І дошкі гонару ёсць. “Імгненне, не спыняйся, ты – агідна!” – сказаў бы цяпер у Беларусі Гётэ.

Здавалася: пераступім запаветную мяжу 2000 году – і ўсё будзе іначай. Так у савецкія часы здавалася: за мяжой, за “жалезнай заслонай” – усё, усё іншае, і трава, і дрэвы, і сонца. А яно і там – тое ж.

Што ж, пераход ад XIX да XX стагоддзя таксама не адбыўся пасля 1900 ці 1901 году, а – пасля 1914 ды 1917-га. І як тады ўсе чакалі – паўстане эра дабра і справядлівасці. А было – з дакладнасцю да наадварот.

Цяпер ружовых ілюзій ніхто не мае. Не, усе спаборнічаюць у стварэнні найчарнейшых сцэнарыяў – ад экалагічнай катастрофы да сутыкнення цывілізацый. Можа і лепш настройвацца на горшае – тады і малое добрае цешыць.

А пакуль – міжчассе, паўза, шэрасць. Былыя куміры паступова сыходзяць, а новых, ім роўных – няма. Смех смехам, а хто ў той жа Англіі з “новых” роўны таму ж Элтану Джону? Ці ў Расіі – Пугачовай? Хто зацьміў Чэслава Немена? “Песняроў”?

Усё выцвіла і здрабнела. Па-ранейшаму растуць у гарадах бетонна-шкляныя каробкі. Так жа тузаюцца ў дыскатэках, падбадзёраныя такімі ж дыск-жакеямі, як і гадоў 30 таму.

Сярод усіх жывёлаў мне найбольш нялюбы крот гісторыі – бо так марудна капае.

Але тыя, чыімі рукамі і галовамі здзейсняцца перамены – яны ўжо нарадзіліся. Яны – сярод нас. Яны набіраюцца моцы.

Проста мы не ведаем іх у твар.

Які ён, гэты твар?..

**Алег Аблажэй**

# «БАЛВАН» ВЯРНУЎСЯ

У старажытнай Вільні – не абы якая падзея. Гаўбец у палацы Тышкевічаў зноў трымаюць два атланты, якіх віленчукі здаўна называюць “балванамі”, а сам палац – “домам пад балванамі”.

У беларускую гісторыю гэты будынак увайшоў самымі слыннымі імёнамі. Тут напрыканцы 19 ст. часта бываў віленскі адвакат Францішак Багушэвіч, які сябраваў з Зыгмундам Нагродскім. Нагродскі, у сваю чаргу, гандляваў сельскагаспадарчымі машынамі і меў у палацы Тышкевічаў склады. Напачатку 20 ст. ён даваў грошы на выданне першай беларускай газеты “Наша Ніва”, а пазней і сама рэдакцыя “НН” размясцілася ў “доме пад балванамі”.

Сёння ў гэтым будынку на скрыжаванні Завальнай і Троцкай месціцца архітэктурны факультэт Віленскага тэхнічнага універсітэта. Год таму ў аднаго з атлантаў урэзаўся на машыне нецвярозы Маркас 3. Пасля гэтага замест скульптуры доўгі час стаяў драўляны слуп. Ванаваты сплаціў за аварыю каля тысячы даляраў і яшчэ больш за 10 тысяч – за новую скульптуру.

Сімвалічна, што “балван” вярнуўся на сваё месца акурат напярэдадні 100-гадовага юбілею “Нашай Нівы”.

**Віленчук**

# НЕВЯДОМАЯ БЕЛАРУСЬ

**7 верасня** 1812 году адбылася знакамітая Барадзінская бітва ў вайне паміж Расіяй і Францыяй. Ураджэнцы Беларусі змагаліся ў гэтай бітве з абодвух бакоў, гэта значыць, забівалі адны адных.

**8 верасня** неафіцыйна адзначаецца Дзень беларускай вайсковай славы. Нагодаю для гэтага свята стала Аршанская бітва 1514 году, у якой беларус гетман Канстанцін Астрожскі са сваім 30-тысячным войскам разбіў 80-тысячную маскоўскую армію. Пабоішча адбылося на рацэ Крапіўне каля Воршы і стала хрэстаматыйнай бітвай еўрапейскага сярэднявечча.

**9 верасня** 1944 году было падпісана пагадненне паміж урадам БССР і Польскім камітэтам нацыянальнага вызвалення аб абмене насельніцтвам. Гэта было звязана з тым, што ад Беларусі да Польшчы адыходзіла населеная беларусамі Беласточчына і паміж дзьвюма краінамі праводзілася мяжа, якая мусіла стаць заходняй мяжой СССР. На падставе таго пагаднення з Беларусі ў Польшчу выехала больш за 27 тысяч чалавек, а з Польшчы ў БССР – 36 тысяч.

**10 верасня** ў Беларусі традыцыйна ўшаноўваўся Майсей. Прычым шанавалі яго чамусьці як збаўцу ад запойнага п’янства. Жанчыны, што пакутавалі ад мужоў-выпівох, звярталіся да Майсея па дапамогу.

**12 верасня** 1712 году на Навагрудчыне прыйшоў на свет Сцяпан Аскерка, якому выпала стаць эканамістам з сусветным імем. Скончыўшы Слуцкую гімназію, а пасля Кёнігсберскі і Берлінскі ўніверсітэты, Аскерка быў запрошаны на пасаду дарадцы юстыцыі да прускага караля Фрыдрыха II. У сваіх эканамічных працах Сцяпан Аскерка апісаў прускі шлях капіталізму ў сельскай гаспадарцы і ўпершыню ўвёў у навуковы ўжытак слова “план”.

# НІНЬ ХАО, ЛАО БАЙ СІН

Магчыма, менавіта так праз дзясятак год пачнуць вітаць адзін аднаго беларускія юнакі і дзяўчаты. Кітайская мова, падобна, мае шанцы займець у нашай краіне статус трэцяй дзяржаўнай. З 1 верасня яе пачалі выкладаць у некаторых школах. А напярэдадні кіраўнік дзяржавы публічна выказаў спадзяванне, што неўзабаве выпускнікі нашых СШ здолеюць свабодна гутарыць на «каком-нибудь европейском или китайском языке». Газета «Салідарнасць» вырашыла ў меру магчымасцяў паспрыяць гэтаму, надрукаваўшы кароткі беларуска-кітайскі слоўнік.

Во ай ні – я кахаю цябе

Дахуй – з'езд

Лао бай сін – дзеравеншчына

Мэй Го – цудоўная краіна

Нінь Хао – прывітанне

Ханкун мудэнь – авіяносец

Чжэнцзэдзі гунян – цнатлівая дзяўчына

Шаонянь – хлопец

Шэн шэн – жыватворная сіла

Юйван сінвэй – ідыёцкі ўчынак

Застаецца толькі марыць пра тое, што нашы чыноўнікі будуць рабіць як мага менш юйван сінвэй. Тады Беларусь будзе па-сапраўднаму Мэй Го.

**www.gazetaby.com**




***Лукашэнка даручыў*** *распрацаваць новыя правілы беларускай мовы з мэтай уніфікацыі яе з рускай, метадам наклейвання на слоўнік "Русский язык" стыкера «Бело».*

**(c) censor.net.ua, www.eggs.net.ua**

**Заснавальнік** ТАА "Тут і цяпер" **Адрас** 220013 г. Менск, пл. Каліноўскага, 1-а
**Галоўны рэдактор** А. Уласаў (email: gazeta@tyt.by) **Тыраж** 299 экзэмпляраў